Некоторые разбрасывали «фантики» (мелочь 10,20,50 рублей), на которые не купишь даже и коробка спичек…

Всё происходящее снимали на камеру неизвестные.

Уже после окончания акции, когда все разошлись, в отделение милиции на разговор с начальником отдела общественной безопасности господином Мартысюком был «приглашён» один из участников акции Артур Эшбаев вместе с женой Александрой и их трёхлетним сыном (!!!) Самиром! Их продержали в Смолевичском РОВД до 22:00! Разговор сводился к «предупреждениям» и предложению написать объяснительную.

Поддержать Артура и его семью к зданию РОВД подошло ещё 12 участников акции, которые также были задержаны без составления протокола. У всех (даже несовершеннолетних) были взяты отпечатки пальцев и переписаны паспортные данные.

Участник акции после выхода из отделения РОВД сообщает в социальных сетях: «Милиция вела себя некультурно: маты, угрозы, «правильные советы»… »

Через час все были отпущены.

**22 июня**

У Смалявічах на цэнтральнай плошчы горада было затрымана не менш за 10 чалавек. Былі непаўнагадовыя. Некаторы час было невядома, што з імі.

Сярод затрыманых дакладна былі Яўген Саблеў і Ягор Драгун. Фармальных падставаў для затрымання не было.

Моладзь зноўку паведамляе пра пагрозы з боку асобных супрацоўнікаў Смалявіцкага РАУС.

"Сабля": «На площадь я с друзьями подошёл примерно в 18:40. На площади была репетиция, возле памятника Ленину стоял милицейский "Уазик". Удивило, как много милиции следило за порядком на репетиции в этот вечер!

Знаю, что всех кто находился на тротуаре на стороне исполкома или сидел вдоль клумб, без объяснения причин, прогоняли сотрудники милиции. Несмотря на то, что кто-то из пришедших пришёл посмотреть на своих детей, которые репетировали. Мы вернулись к памятнику Ленину. Через несколько минут меня насильственно начали затаскивать в "Уазик". Последнее, что я услышал из машины, когда закрывали дверь, команду от милиционера: «Пакуйте остальных»…

Таким образом, в здании Смолевического РОВД нас оказалось 10 человек. Три часа нам не объясняли причины задержания. В очередной раз откатывали пальцы, снимали на камеру, просили объяснительные.

Лично мне угрожали арестом, что я буду ночевать в камере, и судом на завтра, где мне дадут 15 суток.



"Со стороны некоторых сотрудников была грубая речь. В итоге нас просто отпустили после трех часов нахождения там! Ни формальных причин задержания, ни объяснений, ни извинений…."

Таксама вядома, што ў Мінску быў затрыманы хлопец са Смалявічаў – Міхаіл Хведчэня. Ён быў збіты, адпушчаны каля поўначы.

Жодзіна

У Жодзіна выйшла 70 чалавек, Плошчу палівають вадой

Удзельнік акцыі ў Жодзіна паведаміў «НН», што на дзве гарадскія плошчы агулам выйшла 70 чалавек. На мінулым тыдні было 19 чалавек.

Каля ДК БелАЗ адбыліся затрыманні. Затрымана мінімум 5 чалавек. Сярод іх мясцовы журналіст Сяржук Салавей.

Прыгналі палівальныя машыны для мыцця плошчы, людзі гуртуюцца ля помніка Леніна.

**29 чэрвеня**

29 чэрвеня ў Смалявічах маўклівая акцыя прайшла без затрыманняў. На плошчы знаходзілася каля 10 «хлопальнікаў». Яны прыйшлі разам з дзецьмі.

У час правядзення на плошчы не прысутнічалі міліцыянты ў форме, аднак за ўдзельнікамі ўвесь час назіралі невядомыя асобы ў цывільным. Калі «хлопальнікі» сабраліся разыходзіцца, асобы ў цывільным падыйшлі да дзяўчыны з фотаапаратам і сталі патрабаваць знішчыць фотаздымкі.

> "Яны сказалі, што ведаюць, чаго мы тут стаім і ўсё разумеюць. І што я не маю права фатаграфаваць. Сталі патрабаваць сцерці здымкі"

Як паведаміла Еўрарадыё Вольга, невядомыя асобы не захацелі прадставіцца.

Вольга: "Яны сказалі, што ведаюць, чаго мы тут стаім і ўсё разумеюць. І што я не маю права фатаграфаваць. Сталі патрабаваць сцерці здымкі".

Калі астатнія ўдзельнікі акцыі сталі пляскаць у ладкі ім у спіну, «невядомыя» паспешна перайшлі на іншы бок плошчы.

У час акцыі рух на плошчы быў перакрыты, праводзілася рэпетыцыя танцавальнага калектыва гораду.

Еўрарадыё.

## Amnesty International: беспрэцэдэнтнае пагаршэньне сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі

**Радыё Свабода**
http://svaboda.org/

**МІЖНАРОДНАЯ ПРАВААБАРОНЧАЯ** арганізацыя Amnesty International у сваёй заяве канстатуе, што праз 6 месяцаў пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі ціск на іншадумства ў гэтай краіне не слабее.

**AMNESTY INTERNATIONAL** працягвае заклікаць да вызваленьня ўсіх вязьняў сумленьня, якія былі затрыманыя і асуджаныя за мірнае ажыцьцяўленьне свайго права на свабоду сходаў і выказваньне меркаваньняў.

**АРГАНІЗАЦЫЯ ЗНОЎ** заклікае беларускія ўлады паважаць правы ўсіх зьняволеных і правесьці неадкладнае і бесстароннае расьсьледаваньне абвінавачаньняў у парушэньнях правоў чалавека, якія мелі месца, уключаючы катаваньні і жорсткае абыходжаньне ў месцах пазбаўленьня волі.

**АПОШНІЯ ШЭСЬЦЬ** месяцаў назіраецца беспрэцэдэнтнае пагаршэньне сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, адзначае Amnesty International. Ключавыя фігуры апазыцыі былі затрыманыя, сталі ахвярамі жорсткага абыходжаньня і былі асуджаныя па выніках несправядлівых судовых працэсаў. Недзяржаўныя арганізацыі, актывісты грамадзянскай супольнасьці і журналісты зазналі перасьлед.

**НА СЁНЬНЯШНІ** дзень Amnesty International выявіла 12 вязьняў сумленьня ў Беларусі, якія былі асуджаныя ў сувязі з пасьлявыбарнымі пратэстамі. Арганізацыя мяркуе, што сьпіс вязьняў сумленьня можа быць пашыраны, дасьледаваньне кожнага выпадку працягваецца.

**AMNESTY INTERNATIONAL** нагадвае беларускім уладам, што права на справядлівы судовы разбор зьяўляецца асноўным правам чалавека і выступае ў якасьці фундамэнтальнай гарантыі таго, каб людзі не былі несправядліва пакараныя.

**СЬПІС АСОБАЎ**, прызнаных Amnesty International вязьнямі сумленьня, на старонках Радыё Свабода.

# ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ СВЕТЛАЯ ПАМЯЦЬ

## Роля аналітыка робіцца больш відавочнай, бо грамадства ў роспачы



Віталь Сіліцкі

**А ягоныя інтэрв'ю застаюцца актуальнымі і сёння.**
Еўрарадыё

**Пра аналітыку па-беларуску.**

**Віталь Сіліцкі:** Звычайна пад самім тэрмінам "аналітык" разумеецца чалавек, які спрабуе абмяркоўваць, мысліць над нейкімі надзённымі праблемамі жыцця і прапаноўваць нейкія рашэнні тым, каго гэтыя рашэнні датычацца.

На жаль, у нас шмат нейкай абстрактнай мазгавой дзейнасці, не вельмі шмат "public policy". Не вельмі шмат таго, што менавіта звязана з тымі людзьмі, якія прымаюць рашэнні. І людзі, якія прымаюць рашэнні, не заўжды звязаныя з тымі людзьмі, на якіх гэтыя рашэнні ўплываюць. А людзі, якія ўмеюць мысліць мазгамі, не звязаныя ні з тымі, ні з іншымі. Таму яны жывуць кожны ў сваім асяродку.

**Еўрарадыё:** Ці становіцца роля аналітыкі і аналітыка больш важнай падчас крызісу?

**Сіліцкі:** Мяняецца публічная роля чалавека, які называе сябе аналітыкам. Яна робіцца больш відавочнай, таму што грамадства ў роспачы, грамадства сутыкаецца з чымсьці, чаго яно дагэтуль не ведала ці ўжо падзабыла. Сітуацыя нявызначанасці, у якой чалавек хвалюецца і за персанальнае жыццё, і за будучыню, і за лёс сваіх блізкіх. І трэба нейкае тлумачэнне таго, што адбываецца. Таму проста ўзрастае попыт на тлумачэнні.

Ведаеце, цяжка меркаваць пра тое, чаго дагэтуль не ведаў. Адчыняеш кожны дзень аналітычныя зводкі сусветных інфармацыйных агенцтваў — і проста валасы становяцца дыбам. Разумееш, што чым больш ты даведваешся пра гэты крызіс, тым менш ты сапраўды разумееш.

Ёсць пэўныя палітычныя абмежаванні, таму што любыя пазітыўныя прапановы фільтруюцца праз сіта прыярытэтаў, якія мае сама ўлада. Бо яны таксама сутыкнуліся з чымсьці невядомым, што стварае для іх пагрозу. Але ж першымі, хто стварыў гэты попыт на інфармацыю, на нейкую рэфлексію, хутчэй на крытыку і рэфлексію, чым на аналітыку, я б сказаў — гэта былі, канечне, медыі. Таму што ім трэба тлумачыць людзям хоць нешта. Не важна — правільна, няправільна. Гэта гарачая тэма, яна папулярная, яна цікавая.

З пытаннямі практычных рашэнняў нашмат больш складана. Таму што адкрытасць да новых прапаноў не адмяняе старых прыярытэтаў, якія мае ўлада. Скажам, у нас можа адначасова ставіцца задача па прыцягненні замежных інвестыцыяў. І тут можна даць вельмі кваліфікаваную параду, як гэта можна зрабіць. У гэты ж час захоўваюцца старыя задачы — скажам, выкананне прагназных паказчыкаў, якія ніхто не адмяніў, ці захаванне занятасці. Пад гэтыя дзве рэчы ніводны інвестар не прыйдзе. І тут параіць, як "скрестить коня и трепетную лань", не хопіць ніякіх мазгоў і ніякага ўмення. І мне проста вельмі шкада чыноўнікаў, якім даводзіцца працаваць у гэтых умовах, выконваць тое, чаго проста не можа быць.

**Еўрарадыё:** Як вы бачыце будучыню беларускай аналітыкі?

**Сіліцкі:** Тое, што ў нас адбылося – гэта проста адлюстраванне стану публічнай прасторы. Каб вырашаць праблемы выжывання, дзяржаве і думаць шмат не трэба было. Ну, былі два фактары — доступ да расійскай нафты і да расійскага рынку. Зараз усё ўскладняецца. Ускладняюцца перадумовы для выжывання той жа самай сістэмы. І ёй, канечне, давядзецца больш думаць і больш прыцягваць людзей, якія ўмеюць думаць. Гэта пэўны выклік для той часткі аналітычнай супольнасці.

Ведаеце, у высокім грамадстве часта трэба падтрымаць размову. Дык вось тут таксама – трэба будзе падтрымаць размову. Не проста зацыклівацца на агульных рэчах, як звергнуць гэты ненавісны крывавы рэжым. Будзе выклік падтрымаць дыялог па нейкіх практычных пытаннях, па сектаральных пытаннях, па пытаннях, звязаных з нейкімі канкрэтнымі сферамі — ці то энергетыка, ці то эканамічная лібералізацыя, ці то рынак працы, ці то банкаўскі сектар і г.д. І тут ужо будзе патрабавацца іншая кампетэнцыя, і, мабыць, іншыя людзі.

**Пра мову.**

**Віталь Сіліцкі:** Стаўленне моладзі да беларускай мовы пагоршылася за апошні час. І яно зараз горшае, чым у сярэднім па грамадстве — больш моладзі, чым у сярэднім па грамадстве, ўспрымаюць карыстанне беларускай мовай як проста нейкую прыкмету выпендрожу. Хаця, за кошт таго, што яны вывучаюць яе ў школах, яны можа лепш ёй умеюць ёй карыстацца, чым астатняе грамадства. Але ж, гэта група з найменшым жаданнем размаўляць па-беларуску.

Гэта як раз тая сітуацыя, калі адзін і той жа асяродак можа даваць найбольшы адсотак актывістаў-энтузіястаў, але сярэдні паказчык пры гэтым самы нізкі. І гэтыя актывісты вырываюцца менавіта ў знак пратэсту супраць шэрай масы. Бывае і так.

Наша даследаванне паказвае, што зусім неабавязкова, што беларуская мова — гэта мова апазіцыі, мова заходу Беларусі і мова моладзі, як гэта часцяком уяўляецца. Можа мова апазіцыі, але неабавязкова мова апазіцыйна-настроеных людзей. Можа мова заходу, але не мова тых вельмі зрусіфікаваных і спаланізаваных частак той жа Гарадзеншчыны. Можа мова моладзі, але хутчэй мова маленькага асяродку зацятых актывістаў, чым мэйнстрымавай моладзевай гапаты.

**Еўрарадыё:** Ці можна чытаць Караткевіча па-руску? Ці калі гэта рабіць — шмат згубіцца?

**Сіліцкі:** Фізічна чытаць можна. Але акурат Караткевіча я б не раіў чытаць па-руску, таму што гэта ўсё роўна што ў першую шлюбную ноч класціся з надзіманай лялькай. Задавальненне можа і атрымаеш, але якое? Гэта маё асабістае стаўленне да творчасці Караткевіча.

Таксама не пройдзе проста пераклад нейкага славутага дэтэктыву на беларускую мову —усё роўна яго будуць чытаць па-руску. Гэта мусіць быць унікальны цікавы прадукт. Таксама як абсурдна чытаць Караткевіча па-руску, абсалютна абсурдная думка, што нельга чытаць дэтэктывы на беларускай мове.

Людзі часта не зразумеюць, што па-беларуску можа быць цікава, пакуль не пабачаць цікавыя дэтэктывы на беларускай мове. Я вам распавяду гісторыю, як мой цалкам беларускамоўны сябар гуляў у двары са сваімі сабакамі. Ён даваў там ім нейкія каманды. Праходзіць міма жанчына і кажа: "Слушайте, а что ваши собаки правда понимают по-белорусски?"

## Што значыць быць беларусам?

**Прапануем Вашай увазе анкету Віталя Сіліцкага, дырэктара Беларускага з цыкла «Быць беларусам: што гэта значыць»(праект TUT.BY/ Budzma.org).**

**— Быць беларусам — што гэта значыць? Якое значэнне вы ўкладаеце ў слова беларус/беларуска?**

— Жыць у Беларусі, размаўляць па-беларуску, дбаць пра Беларусь, любіць Беларусь.

**— Якія унікальныя беларускія рысы характару і светагляду ўласцівыя беларусам?**

— Ніякіх. Мы такія ж людзі, як усе. Можа, беларусам уласціва якраз самазамілаванне ад сваёй «выключнай» працавітасці, гасціннасці, талерантнасці. Не верацьяны, што немец можа гасцінна адчыніць дзверы, а казах — прыняць вас такім, які вы ёсць. Але гэта ад слабага ведання свету.

**— Назавіце тры/пяць асноўных падзеяў з гісторыі Беларусі, без ведання якіх — беларус не беларус.**

— 3 «уявімай» гісторыі Беларусі:

1. Крэўская унія
2. Выданне скарынаўскай Бібліі
3. Стварэнне літоўскіх статутаў
4. Берасцейская і Люблінская вуніі
5. Патоп 1654—1667 гг.

3 найноўшай гісторыі Беларусі:

1. Паўстанне 1863 года.
2. Выданне «Дудкі беларускай» Багушэвічам
3. Абвяшчэнне БНР
4. Рэпрэсіі 1930-х гг.
5. Другая сусветная вайна
6. Чарнобыль.

**— Якія традыцыі павінен ведаць і захоўваць беларус?**

— Тыя, якія ён здолее найперш адрадзіць. Традыцыі 8 сакавіка і 23 лютага добра было б «падладзіць» пад Дзень Мамы і Дзень Таты, як хрысціяне калісьці падладжваліся пад паганскія святы. А традыцыі ў кожнага народа аднолькавыя — шанаваць Божае нараджэнне і ўваскрашэнне, продкаў, сваю свабоду і незалежнасць.

**— Беларус без ведання мовы ці беларус?**

— Так, калі ён лічыць сябе беларусам, калі яму неабыякавы лёс Беларусі і яго суродзічаў. Для мяне размаўляць па-беларуску — прынцыпова, але я паважаю тых, каму не.

**— Чым беларускім вы ганарыцеся?**

— Нарачанскім хлебам і дранікамі, скарынаўскай Бібліяй і літоўскімі статутамі, гандболам і гімнастыкай, «БелАЗам»і і СУ, «Песнярамі» і «Троіцай», Крамбамбуляй і Белавежскай, беларускім балетам і віленскім барока, Быкавым і Караткевічам, ARCHE і «Нашай Нівай», карацей, ёсць чым.

**— Што робіць нас беларусаў адметнымі сярод суседзяў?**

— Своеасаблівыя афіцыйныя герб і сцяг.

**— Што робіць беларусаў адметнымі ва ўсім свеце?**

— Дастаткова, каб яны самі ў свеце называліся беларусамі, а не from Russia.

**— Як вы бачыце будучыню Беларусі?**

— Светлай і прыўкраснай.

# БЫВАЙ, ДАРАГІ СЯБРА! ВОЛЬГА СТУЖЫНСКАЯ



Вольга Стужынская і Віталь Сіліцкі

Віталь адпакутаваў і сышоў пасля доўгіх месяцаў барацьбы з хваробай, што хутка прагрэсавала і не пакінула яму шанцу на выздараўленне. Ён быў выбітным палітолагам, амбітным кіраўніком свайго дзецішча, Беларускага інстытуту стратэгічных даследванняў (BISS), аўтарам кніг і артыкулаў. Для мяне ж ён, у першую чаргу, быў блізкім сябрам, з якім мы гутарылі кожны дзень у скайпе, катораму я тэлефанавала адным з першых падчас кожнай паездкі ў Мінск, і мы сустракаліся амаль кожны дзень, каб пагутарыць і пра справы, і пра ўсё на свеце…

Мы пазнаёміліся ў Стэнфардскім універсітэце пяць год таму. Вялікі, як teddy bear, і заўсёды у добрым настроі, з гучным смехам і любоўю да футбола: такія мае першыя ўспаміны пра яго. Мы разам хадзілі па кампусе ўніверсітэта, сядзелі ў кавярнях і гутарылі па-беларуску пра Беларусь. Я ў той час была занятая развіццём «Офіса за дэмакратычную Беларусь» у Брусэлі, Віталь заканчваў свой гадавы праект у Стэнфардзе і думаў над тым, што рабіць далей. Ён вырашыў вярнуцца ў Беларусь, нягледзячы на тое, что мог зрабіць бліскучую кар'еру за мяжой. Яго любоў да сінявокай Беларусі была непамернай, як і прага працаваць на яе карысць.

Інстытут стратэгічных даследаванняў, заснаваны Віталём з калегамі, стаў першай сапраўднай «фабрыкай думкі» ў Беларусі. Віталікава шыкоўная адукацыя і рэдкія аналітычныя здольнасці ўвялі новы для Беларусі стандарт у галіне аналітыкі. Матэр'ялы BISS'у хутка сталі чытанымі ў еўраінстытутах, нацыянальных парламентах, міжнародных арганізацыях і амбасадах. Мы разам ладзілі шматлікія прэзентацыі і круглыя сталы ў Брусэлі ды іншых гарадах, працавалі над артыкуламі і канферэнцыямі.

А паміж усёй гэтай працай мы па-сяброўску жартавалі пра наша BISS-ODB інстытуцыянальнае партнёрства, «жабілі» фотаздымкі адно аднаго, выдумлялі меню для рэстарацыі «Дажынкі», якую, казалі, калі-небудзь разам адчынім у Мінску.

У мінулым годзе, пасля таго як Віталю выдалілі адну нырку, ён быў такі шчаслівы, што метастазы не пайшлі па целе. Падавалася, хвароба сышла. Ён цудоўна выглядаў, часам раіўся наконт таго, які лепш купіць касцюм ці гальштук. Ён жыў з асалодай і адчуваннем шчасця.

Мы разам былі на плошчы 19 снежня. Разам беглі ад АМАПу і хаваліся ў гатэлі «Мінск». Разам не маглі паверыць у тое, што адбываецца, і пісалі супольную заяву па падзеях пасля выбараў. Плошча, я мяркую, дадала шмат да пагаршэння яго стану, пра які ён яшчэ і не ведаў, але, думаю, здагадваўся.

Праз некалькі тыдняў Віталік думаў, што загрыпаваў. Насамрэч гэта быў пачатак канца, бо метастазы знайшлі ў вялікай колькасці ў абодвух лёгкіх. Сябры і калегі з інстытута збіралі сродкі на лячэнне, даглядалі яго ў Мінску. Мы арганізавалі магчымасць кансультацый у Бельгіі. Ён шмат часу правёў тут, у Брусэлі: спачатку на незлічоных тэстах, потым на бальнічным ложку ў адной з найлепшых анкалагічных клінік Еўропы. Я да апошняга дня верыла, што ён вылекуецца, і дужа злавалася на Віталікавы настрой і адчай… Да апошняга дня, калі доктар сказаў «пагутарыць з сям'ёй» і забіраць яго ў Мінск, бо інакш ён не вернецца на радзіму жывым.

Мы з калегамі арганізавалі яго дарогу дадому. Паміраць. Наш Віталя вяртаўся да сваёй сінявокай Беларусі, каб назаўжды застацца з ёй. Ён так шмат яшчэ хацеў зрабіць для яе, ды не паспеў.

Пухам табе зямля, мой даражэнькі сябра. Калі-небудзь я прыйду да цябе на магілу, каб расказаць пра перамены, што адбыліся ў Беларусі, тыя перамены, у якія ты верыў і на якія працаваў. Мы назавем тваім імем універсітэт ці вуліцу ў Мінску. І за нас дваіх я адкрыю рэстарацыю «Дажынкі»..

## « Памяці Віталя Сіліцкага, працяг

таго, што вывучае, неабыякавы да лёсу Беларусі.

Прычым, Віталь імкнуўся дасьледаваць рэчаіснасьць, а потым ужо рабіць навуковыя высновы. Ён – лідэр навуковага аналізу.

Яшчэ адзін вучань Віталя Сіліцкага палітоляг **Андрэй Казакевіч** пацьвярджае:

"Гэта быў адзін з самых інтэграваных ва ўсясьветную паліталягічную супольнасьць навукоўцаў. Віталь атрымаў добрую адукацыю ў заходніх унівэрсытэтах, ён быў з той генэрацыі палітолёгаў, якія дасканала ведалі ангельскую мову і ўмелі весьці дыялёг з навукоўцамі ЗША і Эўропы".

Беларусь страціла за гэты год некалькі знакавых фігур, постацяў паліталягічных і філязофскіх навук – Сьвятлану Навумаву, Уладзімера Конана, і вось зараз – Віталя Сіліцкага".

Віталь Сіліцкі доўгі час узначальваў Беларускі інстытут стратэгічных дасьледаваньняў (BISS). Калега па цэху палітоляг **Уладзімер Мацкевіч** кажа:

"Віталь Сіліцкі быў выбітнай , вельмі прыкметнай фігурай на беларускай паліталягічнай прасторы. Ён атрымаў бліскучую адукацыю, стаў аўтарытэтным аналітыкам. Узначаліўшы BISS, ён дамогся таго, што інстытут стаў адной з найбуйнейшых аналітычных структур Беларусі. Віталь, да таго ж, быў вельмі актыўным і камунікабельным чалавекам. Ён быў у няпростых адносінах з калегамі па цэху – часта спрачаўся зь імі, крытыкаваў. Але зь ім было надзвычай карысна і цікава спрачацца. Мы панесьлі вялікую страту – зьнік апанэнт, дзякуючы якому зьяўляліся цікавыя, выверaныя, абгрунтаваныя погляды на беларускія праблемы".

Літаратуразнаўца **Аляксандар Фядута** прызнаўся, што страціў свайго самага цікавага апанэнта:

"Віталь Сіліцкі быў тым чалавекам, зь якім было прыемна спрачацца. Ён заўсёды ўмеў пачуць аргумэнты суразмоўцы і вельмі дакладна сфармуляваць уласныя аргумэнты. Гэтыя якасьці амаль страчаныя ў беларускай публічнай прасторы.

Мне асабіста будзе вельмі не хапаць Віталя менавіта таму, што ня будзе зь кім паспрачацца. Пасварыцца – ёсьць зь кім, а вось паспрачацца – няма..."

Янка Запрудны (ЗША)

Перадчасная сьмерць Віталя Сіліцкага нанесла вялізарную страту беларускаму грамадзкаму, палітычнаму й навуковаму жыцьцю.

Выбыў з актыву аналітыкаў сучаснага палітычнага раздарожжа ў Беларусі сьветлагаловы палітоляг Віталь Сіліцкі. Як камэнтатар беларускай сучаснасьці, Віталь адзначаўся ня толькі шырокім кругаглядам — набыткам грунтоўнай асьветы — але й грамадзянскай адвагай. Віталь гаварыў публічна тое, да чаго прыходзіў на аснове аналізу падзеяў і сытуацыі.

Нехта трапна сказаў: трэба быць адважным, каб весьці спрэчкі з ворагам, але яшчэ больш адважным, каб спрачацца зь сябрамі.

Віталь не баяўся спрачацца зь сябрамі, бо навуковая сумленнасьць была яму даражэйшай за аднадумства з прыяцелямі.

Грамадзянская адвага была асаблівa дадатнай рысай Сіліцкага-палітоляга, бо ў беларускім публічным дыскурсе выказваньне непапулярнай думкі выклікае цірэдчас з боку порсткіх (часта ананімных) камэнтатараў абразьлівыя словы й мянушкі. Аляксандар Фядута, адзін зь Віталевых сяброў, з жалем сказаў пасьля ягонай сьмерці: у нас ёсьць шмат людзей для сварак, але мала для спрэчак. А зь Віталем было цікава спрачацца. Ён плённа стымуляваў грамадзкую думку, і ў гэтым наша найвялікшая страта зь ягоным адыходам.

У мяне зь Віталем завязалася самая цесная сувязь яшчэ з часу ягонага студэнцтва ў Ратгерскім унівэрсытэце, дзе ён рабіў бакалаўрат. Ягонае зацікаўленне кампаратыўным мэтадам вывучаньня сацыяльных і палітычных зьяваў заўсёды давала тэму да гутарак і спрэчак, у якіх ён выпрацоўваў свой падыход да ацэнак рэчаіснасьці.

Калі ж у 2005 годзе выдавецтва Скеркроў Прэс зьвярнулася да мяне з прапановай перавыдаць мой англамоўны, апублікаваны ў 1998 годзе,«Гістарычны слоўнік Беларусі» (а ўзяцца за гэта я ня мог дзеля занятасьці), я параіў выдавецтву зьвярнуцца да Сіліцкага. Віталь ахвоча згадзіўся. Нам двум быў запрапанаваны кантракт, які мы падпісалі ўлетку 2006 году. Дамова прадугледжвала, што слоўнік выйдзе пад двума прозьвішчамі: Сіліцкага й Запрудніка. Віталь салідна папрацаваў над дапаўненьнем даведніка і ён выйшаў у 2007 годзе ў сэрыі «Гістарычныя слоўнікі Эўропы». Апрача гэтага, кніга была апублікаваная ў мяккай вокладцы ў сэрыі «From A to Z».

У сваёй прадмове да другога выданьня «Гістарычнага слоўніка Беларусі» Віталь прысьвяціў яго памяці Ўладзіміра Каткоўскага, маладога журналіста й навукоўца, які перадчасна памёр у веку 31-го году. Якая трагічная іронія лёсу: адзін паміраe ў 31 год, а другі — у 38!

У прысьвяцэ Віталь напісаў: «Асобы Ўладзіміра Каткоўскага я ніколі не сустракаў, але ягоныя непаслабныя намаганьні пашыраць беларускую мову, культуру й гісторыю ў інтэрнэце прывялі да стварэньня шматлікіх інтэрнэтаўскіх рэсурсаў, якімі я карыстаўся ў сваёй працы».

Уладзімір Каткоўскі зыйшоў з жыцьця 26 травеня 2007 году, акурат дзень перад тым як Віталь выслаў да друку свой апрацаваны манускрыпт гістарычнага слоўніка.

Сьветлыя постаці двух заўчасна памерлых навукоўцаў і патрыётаў, завочна зьяднаных у пошуку выйсьця Беларусі з постсавецкага тупіка, стаяць сёньня перад намі як сымбаль беларускай гістарычнай трагедыі.

Але іхныя постаці адначасна — і сьведчаньне таго, што беларуская народная глеба ня страціла свае самаабароннае пладавітасьці, ня страціла свайго нацыянальнага імунітэту.

Вечная памяць Віталю Сіліцкаму ў вечнай Бацькаўшчыне, якой ён шчодра паслужыў сваім зямным жыцьцём!

# Я - ЕЎРАПЕЕЦ




## Еўрапейскі шлях

**Мы працягваем аднаўленне рубрыкі “Я- Еўрапеец“** (**http://smaliavichy.by/category/european/**).

У межах дадзенай рубрыкі мы працягваем папулярна, даступна, цікава, на прыкладах з жыцця еўрапейскіх грамадзян рэгулярна апавядаць Вам аб новых выкліках, што прыняла Еўропа. Меркаванні палітыкаў і эканамістаў аб прычынах зацяжнога крызісу. Меркаванні еўрапарламентарыяў і еўрапейцаў аб тым, чаму развіўся эканамічны крызіс і магчымыя шляхі яго пераадолення. Сцісла аб механізмах пераадолення сусветных крызісаў. Асноўны акцэнт праграмы – ці змогуць еўрапейскія краіны без страт выйсці з крызісу. Асноўныя эканамічныя праблемы, якія агаліў крызіс.

Праект «Еўрапейскі шлях» – гэта другі праект пасля «Я – Еўрапеец», які створаны ЗАО «Sugardas» і фінансуецца з праектных сродкаў Еўрапейскага Парламента. Праект «Еўрапейскі шлях» – і для нас. Ці пойдзем мы еўрапейскім шляхам ад крызіса далей?

У межах праекта ЗАО «Sugardas» будзе створана 13 праграм для тэлебачання на літоўскай і рускай мовах. Праграмы транслююцца ў Літве, Латвіі, Эстоніі.

Зараз на партале змешчаны наступныя праграмы праекта. Вы можаце спампаваць артыкул ці прагледзець відэа-перадачу.

1**. Дыягназ – крызіс. Вытокі еўрапейскага эканамічнага крызісу ва ўмовах глабальнай эканомікі**

Агульная карціна эканамічнага спаду ў еўрапейскіх краінах ва ўмовах сусветнага крызісу. Сітуацыя на бягучы момант у розных краінах ЕС. Меркаванні палітыкаў і эканамістаў аб прычынах зацяжнога крызісу. Меркаванні еўрапарламентарыяў і еўрапейцаў аб тым, чаму развіўся эканамічны крызіс і магчымыя шляхі яго пераадолення. Сцісла аб механізмах пераадолення сусветных крызісаў. Асноўны акцэнт праграмы – ці змогуць еўрапейскія краіны без страт выйсці з крызісу Асноўныя эканамічныя праблемы, якія агаліў крызіс.

**2. Першыя крокі, або ў якім кірунку рухацца еўрапейскім краінам.**

Стварэнне Камітэта фінансавага, эканамічнага і сацыяльнага крызісу Еўрапейскага парламента. Асноўныя мэты, задачы камітэта і напрамкі працы. Ці зможа камітэт скаардынаваць стабілізацыйную палітыку краін ЕС? Фонды дапамогі краінам ЕС, якія яшчэ не ўваходзяць еўразону. Меркаванні еўрапейцаў аб тым, як крызіс паўплываў на іх паўсядзённае жыццё. Асноўны акцэнт праграмы – ці атрымаецца еўрапейскім чыноўнікам вывесці ЕС з крызісу.

**3. Больш Еўропы! Еўрапейскі план па аднаўленні эканомікі**

Прыняцце правілаў аб штогадовай справаздачнасці краін-членаў па бюджэце («Еўрапейскі семестр»), стварэнне еўрапейскай фінансавай сістэмы, распрацоўка сістэмы штрафаў краінам, якія парушаюць агульныя правілы, гарманізацыя падаткаў на зберажэнні, ацэнка прапаноў аб распрацоўцы механізмаў выхаду з зоны еўра і ЕС. Інтэрв'ю з эўрапарлямэнтарамі, прадстаўнікамі навуковай супольнасці. Меркаванне еўрапейцаў аб тым, хто і як дапамагае ім пераадолець эканамічны крызіс? Асноўны акцэнт праграмы – якія прынятыя ЕП палітычныя меры па пераадоленні крызісу прынеслі станоўчыя вынікі?

**4. Зона еўра. Стварэнне еўрапейскага стабілізацыйнага механізму**

Найбольш пацярпелі ад крызісу краіны ЕС. Маштабная дапамогу Грэцыі. Становішча ў Грэцыі, каментары экспертаў. Ці пагражае Латвіі дэфолт? Становішча ў Латвіі, каментары экспертаў. Меркаванне латышоў аб становішчы ў краіне. Эстонская феномен – ўступленне ў зону еўра ў разгар крызісу. Як працэс «еўрапізацыі» уплывае на эканоміку краіны. Меркаванне эстонцаў аб тым, як увядзенне еўра паўплывала (-е) на іх жыццё? Меркаванне еўрапейцаў аб тым, ці вераць яны ў эканоміку зоны еўра? Асноўны акцэнт праграмы – ці дзейнічае еўрапейскі стабілізацыйны механізм, і ў якіх краінах больш паспяхова за ўсё.




I love SM

жадаеш атрымаць такую футболку?

Smaliavichy.by

дашлі гісторыю пра пераезд і атрымай бескаштоўна

Інфарматыўны бюлетэнь горада Смалявічы “Горад Наш“
Галоўны рэдактар: Яўген Смалявіцкі,
Мастацкі рэдактар: Зорачка.
Тыраж: 299 ас.
E-mail: goradnasz@gmail.com
Распаўсюджваецца бясплатна.
Складальнік: Грамадская ініцыятыва “За Новыя Смалявічы“

Заўжды свежая і актуальная інфармацыя на гарадскім партале Смалявічаў
www.Smaliavichy.by